# ПРАБЛЕМА ДЗЯРЖАЎНАСЦІ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРЫЯД З ЛЮТАГА 1917 Г. ПА КАСТРЫЧНІК 1917 Г.

Райчонак А. А.г. Мінск, БГТУ

На нашу думку, разглядваемы перыяд характарызуецца агульнай тэндэнцыяй актывізацыі беларускага нацыянальнага руху, выхадам яго з фактычнага падполля і прыўнясеннем пытання аб самавызначэнні Беларусі ў шырокія масы ў ходзе нарастання нацыянальнага і рэвалюцыйнага руху.

Першыя звесткі аб Лютаўскай рэвалюцыі трапілі на Беларусь 28 лютага 1917 г. Першага сакавіка больш дакладныя дадзеныя былі атрыманы ў Віцебску. 2–3-га сакавіка гэтае паведамленне дайшло да ўсіх губернскіх цэнтраў неакупаванай Беларусі.

Адразу ж пасля звяржэння царызму пачалася актыўная праца па стварэнню органаў, якія спрабавалі вырашыць пытанне аб уладзе ў Беларусі. Гэта праца, на наш погляд, вялася адразу па чатырох накірунках, што было выклікана розным разуменнем будучага рэвалюцыйнай Расіі ўвогуле і Беларусі, ў прыватнасці. Асноўная дзейнасць у гэтым накірунку была разгорнута Саветамі рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў; органамі, утворанымі Часовым урадам; органамі вайсковага камандавання Заходняга фронту; узнікшым некалькі пазней Беларускім нацыянальным камітэтам.

Характарызуючы беларускі рух пасля Лютаўскай рэвалюцыі, будзе да месца прывесці меркаванне М. Доўнар-Запольскага, які пісаў: ”Што датычыць усходняй Беларусі, то Лютаўская рэвалюцыя застала беларускі рэвалюцыйны кірунак у момант няяснасці яго праграмы і канчатковых мэт. Нацыянальная ідэя, ідэя нацыянальнага адраджэння аб’ядноўвалі колы беларускіх работнікаў Петраграда, Мінска, Масквы і Вільні, але прыватнасці палітычнай ідэалогіі былі не ясныя, або, хутчэй, розныя элементы беларускіх рэвалюцыйных колаў не дамовіліся адносна вострых пытанняў будучыні” [1. с. 469].

Гэтыя рознагалоссі ў многім ускладнілі развіццё нацыянальнага руху, што яшчэ доўгі час адбівалася на практычнай працы нацыянальных арганізацый. Фактычна, на працягу ўсяго 1917 г. ім прыходзілася звяртацца да ўнутрыарганізацыйнай

палемікі аб шляхах далейшага развіцця Беларусі. Гэта аб’ектыўна аслабляла нацыянальна-дзяржаўны рух.

Тым не менш, пасля Лютаўскай рэвалюцыі беларускі нацыянальна-вызваленчы рух пачаў набываць шырокі, арганізаваны характар. У першыя дні рэвалюцыі ў Мінску ўтварыўся Беларускі нацыянальны камітэт, які распачаў энергічную арганізацыйную і прапагандысцкую працу. Так, 25 сакавіка ў Мінску адбыўся з'езд беларускіх нацыянальных арганізацый, на якім прысутнічала каля 150 дэлегатаў. Асноўнай мэтай з'езда з'яўлялася выпрацоўка задач беларускага руху ў новых ўмовах. Ён паставіў пытанне аб неабходнасці адкрыцця беларускага ўніверсітэта і стварэння нацыянальнай школы, прыняў пастанову аб выданні газеты. Этнаграфічная камісія з'езда адзначыла, што ў склад Беларусі ўваходзяць Мінская, Гродзенская, Магілёўская, а таксама часткі Смаленскай і Чарнігаўскай губерняў. Пры гэтым быў выказаны пратэст супраць уключэння Віленскай губерні ў склад Літоўскай рэспублікі. З'езд таксама выказаўся за аўтаномію Беларусі ў складзе Расійскай федэрацыі [2. с. 32]. У дэкларацыі, прынятай з'ездам, у прыватнасці, гаварылася: “Беларускі нацыянальны з’езд... упэўнены, што яго нацыянальны урад, апіраючыся на ўсіх жыхароў Беларусі, прынясе карысць агульнадзяржаўнаму будаванню на фундаменце федэратыўнага строю, даручае сваім дэлегатам давесці аб гэтым да ведама часовага ўраду” [3]. У дэлегацыю ўвайшлі 7 чалавек.

Нягледзячы на тое, што дэлегацыя, накіраваная ў сярэдзіне красавіка для гэтых мэтаў, была прынятая Часовым урадам, які згадзіўся наладзіць пастаянны кантакт з БНК, канкрэтныя прапановы з боку дэлегацыі былі сустрэты холадна. Было заяўлена, што гэтае пытанне знаходзіцца ў кампетэнцыі будучага Устаноўчага сходу і Часовы ўрад не мае паўнамоцтваў на яго вырашэнне. Усё гэта прывяло беларускіх дзеячоў да ўсведамлення таго, што сапраўдную волю Беларусь здабудзе толькі тады, калі за палітычнымі лозунгамі будзе стаяць маса – арганізаваны народ.

Што тычыцца іншых гарадоў Расіі, то нацыянальныя палітычныя і культурныя арганізацыі сярод бежанцаў утварыліся ў Кіеве, Адэсе, Маскве, Калузе, Саратаве, Тамбове, Казані і інш. Іх спрабавала аб’яднаць Беларуская народная грамада на

арганізаваных ёю ў Маскве Усерасійскіх з’ездах бежанцаў-беларусаў.

На працягу лета адбывалася дыферэнцыяцыя беларускага руху. На з’ездзе беларускіх арганізацый і партый 8 – 10 ліпеня 1917 г. адбыўся раскол, у выніку якога перамогу атрымала Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ). БНК быў ліквідаваны, а замест яго быў абраны Выканаўчы камітэт Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый, да якой перайшло кіраўніцтва беларускім рухам. Гэта была не проста перамога “левай плыні” над “правай”. Пасля з’езду лозунг палітычнай аўтаноміі Беларусі канчаткова пачаў пераважаць над лозунгам абласной аўтаноміі.

На пытанне, чаму ж у разглядваемы перыяд (вясна – восень 1917 г.) не быў здзейснены пераход ад ідэі аўтаноміі да ідэі дзяржаўнай незалежнасці, здаецца, трапна выказаўся А. Луцкевіч, які пісаў: “Беларуская палітычная работа развілася пад двумя лозунгамі: нацыянальнага адраджэння і ў першы перыяд рэвалюцыі – аўтаноміі Беларусі ў межах федэрацыйнай Расейскай Рэспублікі. Пры тагачасных варунках гаварыць аб нечым вялікшым не было ніякае магчымасці, што пацьвярджае факт, што нават шмат сільнейшая за беларусаў Украіна не магла адкрыта гаварыць аб дзяржаўнай незалежнасці, укрываючы свае праўдзівые палітычныя ідэалы пад маскай аўтанамізму. Толькі ў найбольш канспірацыйных кружках ішлі гутаркі аб шырэйшых палітычных ідэалах” [4. с. 9].

З некалькі іншага боку да гэтага пытання падыходзіць даследчык Г. Парэчын: “Гаварыць аб аддзяленні ад Расіі тады ў шырокіх колах беларускага руху было раўнацэнна таму, што гаварыць за аб’яднанне з Польшчай. Усе слаі насельніцтва ў той час цвёрда прызнавалі, што незалежнае існаванне Беларусі – немагчыма” [5. с. 12]. Паколькі ён у той час знаходзіўся ў Мінску, яго сведчанне можна лічыць больш каштоўным.

Да вышэй выкладзенага трэба дадаць невялікі каментарый. Чаму ў грамадскім усведамленні самавызначэнне Беларусі выглядала як імкненне далучыцца да Польшчы? Справа ў тым, што Германія планавала стварыць польскую дзяржаву як буфер паміж ёю і Расіяй і к 1917 г. гэтае пытанне выглядала як практычна вырашанае. Аб тым, што ствараецца незалежная Польшча, было добра вядома ў Беларусі. Ведаючы аб старых дамаганнях палякаў да беларускіх зямель, мясцовае насельніцтва лічыла, што пад

“самавызначэннем Беларусі” хаваецца не што іншае, як проста імкненне адарваць ад Расіі як мага болей зямлі, якая затым сама сабою будзе далучана да Польшчы. Да гэтага трэба яшчэ дадаць і культывіраванне ў папярэдні час паланафобіі сярод беларусаў царскімі ўладамі.

Калі характарызаваць адносіны Часовага ўрада і Саветаў да дзейнасці беларускіх арганізацый у той час, то органы Часовага ўрада адмаўляліся як-небудзь вырашаць беларускае пытанне, спасылаючыся на тое, што гэта знаходзіцца ў кампетэнцыі Устаноўчага сходу. Што ж тычыцца Саветаў, то, як пісаў В. Кнорын, “усё лета паміж Саветамі і Беларускай грамадой не было сутыкненняў” [6. с. 74.], але гэта працягвалася толькі да таго часу, пакуль бальшавікі не ўбачылі ў беларускім руху праціўнікаў у барацьбе за ўладу.

Беларускі рух, які ў пачатку Лютаўскай рэвалюцыі не меў дастатковых сіл, каб уключыцца ў барацьбу за ўладу, паступова набываў гэтыя сілы. Паказчыкам гэтага працэсу можа быць колькасны рост найбольш уплывовай беларускай партыі БСГ. З сярэдзіны лета да кастрычніка 1917 г. колькасны склад партыі ўзрос з 5 тыс. чалавек да 10 тыс., гэта значыць, за 3 з невялікім месяцы партыя павялічылася ў 2 разы. Для таго, каб уявіць ступень яе ўплыву, трэба нагадаць, што напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі беларускі нацыянальны рух выяўляўся ў дзеянні нешматлікіх, разрозненых груп.

Восенню 1917 г. пачалася паласа беларускіх вайсковых з’ездаў, якія з’явіліся новай моцнай плынню беларускага руху. На Усерасійскай дэмакратычнай нарадзе была абвешчана Дэкларацыя Беларускай вайсковай арганізацыі. У ёй выстаўляліся наступныя патрабаванні: “Мы, беларусы-вайскоўцы, ідучы нага ў нагу з прадстаўнікамі іншых нацыянальных дэмакратый Расіі, заяўляем: 1) аб катэгарычнай безадкладнасці пастуліравання Расійскай Дэмакратычнай Рэспублікі на федэратыўных пачатках, 2) аб неадкладнай неабходнасці правядзення ў жыццё пачаткаў аўтаноміі Беларусі … 5) склікання Беларускага ўстаноўчага сходу” [7, с. 44]. Як бачна, ў заяве даволі выразна гучыць патрабаванне аўтаноміі.

18 – 24 кастрычніка адбыўся з’езд вайскоўцаў-беларусаў Заходняга фронту і прадстаўнікоў XII арміі, Балтыйскага флоту, Румынскага фронту. У рэзалюцыі, прынятай ім, гаворыцца, што

сваёй задачай ён лічыць: “палітычнае, культурнае і эканамічнае адраджэнне беларускага народа, аб’яднанне ў Беларускай Радзе ў Мінску, каб агульнымі намаганнямі беларускі народ, апіраючыся на здабытую аўтаномію, мог заняць месца ў вялікай Расійскай федэратыўнай (саюзнай) дэмакратычнай рэспубліцы як раўнапраўны член” [8].

Пасля таго, як у Часовую Цэнтральную Вайсковую Беларускую Раду (ЧЦВБР) ўвайшлі прадстаўнікі, абраныя на вайсковых з’ездах Паўднёва-Заходняга і Паўночнага франтоў, з яе назвы было выключана слова “часовая”, і Цэнтральная Вайсковая Беларуская Рада стала галоўным каардынатарам беларускага руху ў арміі. Разам з Цэнтральнай Радай Беларускіх арганізацый, якая на сваёй другой сесіі (15-24 кастрычніка) была рэарганізавана ў Вялікую Беларускую Раду, ЦВБР распачала арганізацыю агульнабеларускага з’езда, які б канчаткова вырашыў лёс Беларусі. Для гэтага меркавалася агульнымі намаганнямі згуртаваць вакол ВБР усе беларускія сілы.

Падводзячы вынікі стану развіцця ідэі беларускай дзяржаўнасці напярэдадні спробаў яе практычнай рэалізацыі, можна зазначыць наступнае. Па-першае, беларуская нацыя ў гэты час уступіла ў заключную фазу свайго фарміравання і была гатова весці барацьбу за права на самавызначэнне, але асаблівасці яе гістарычнага лёсу прывялі да пэўнай дэфармацыі яе сацыяльнай і эканамічнай структуры. Сярод галоўных праблем, якія заміналі працэсу дзяржаватворчасці, былі слабая класавая дыферэнцыяцыя, нізкі ўзровень урбанізацыі, развіццё капіталістычнай вытворчасці пераважна ў сельскай гаспадарцы пры наяўнасці значных перажыткаў феадалізму і вялікай аграрнай перанаселенасці, адсутнасць сістэмы нацыянальнай адукацыі і буйных універсітэцкіх цэнтраў. Па-другое, беларускі нацыянальны рух выпрацаваў свае асноўныя ідэалагічныя палажэнні, сярод якіх адно з галоўных займала патрабаванне права на самавызначэнне беларускай нацыі і патрабаванне аўтаноміі ў якасці канкрэтнай формы ўвасаблення гэтага права. Гэтыя патрабаванні былі характэрнымі і для іншых еўрапейскіх нацыянальна-вызваленчых рухаў дадзенага часу, што дазваляе разглядаць беларускі нацыянальны рух як частку еўрапейскага. Па-трэцяе, Першая сусветная вайна і Лютаўская рэвалюцыя выступілі ў якасці каталізатара беларускага

нацыянальнага руху і значна прасунулі наперад яго палітычныя патрабаванні. У гэты час фактычна фарміруюцца ўсе галоўныя ідэалагічныя плыні беларускага нацыянальнага руху і выпрацоўваюцца асноўныя падыходы да праблемы ўвасаблення беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці.

Выкарыстаная літаратура


1. Доўнар-Запольскі, М.В. Гісторыя Беларусі / М.В. Доўнар-Запольскі. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1994. – 510 с.
2. Жылуновіч З. З’езд беларускіх нацыянальных арганізацый 25 сакавіка 1917г. // Полымя. – 1925. – № 6.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 60. – Воп. 3. – Сп. 151. – Арк. 3.
4. А.І. Усходняя Беларусь: Статыстыч. і гіст. матэрыялы. / А. І. – Мінск., 1918. – 56 с.
5. Парэчын, Г. Ідэя беларускай дзяржаўнасці перад утварэннем Савецкай Беларусі.// Запіскі адзелу гуманітарных навук: Працы кафедры сучаснага права. / Г. Парэчын – Мінск, 1929. – Т. 1.
6. Кнорин В. 1917 в Белоруссии и на Заподном фронте. / В. Кнорин – Мінск., 1925. – 182 с.
7. Рудовіч С. Пошукі шляхоў да беларускай дзяржаўнасці (1917 г.) // Беларускі гістарычны часопіс. – 1995. – № 4.
8. НАРБ. – Ф. 60. – Воп.3 – Сп. 338. – Арк. 7.


## ТАДЭВУШ КАСЦЮШКА І ЯГО АДНОСІНЫ ДА ДЗЯРЖАЎНАГА ЛАДУ І ПРАВА


Саракавік І.А.г. Мінск, Акадэмія кіравання пры
Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь


Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка (1746 – 1817 гг.) больш вядомы як кіраўнік паўстання 1794 г. і менш сваімі поглядамі на дзяржаўнасць і права. Яны выкладзены ў шэрагу яго прац. У «Мемарыяле аб Польшчы» (1793 г.) Касцюшка адзначыў значнасць і ролю Французскай рэвалюцыі ў распаўсюджванні па ўсёй Еўропе прынцыпаў свабоды і роўнасці. У той жа час, перамога Французскай рэвалюцыі, лічыў Касцюшка, гэта аснова новага дзяржаўнага ладу Польшчы. Тут жа ён выклаў праграму рэвалюцыйнай перабудовы Рэчы Паспалітай на рэспубліканскіх,